Источник: "Настаўніцкая газета" - 2012-10-13



# Пераздаць археалогію на "выдатна"

**Супрацоўніцтва паміж вучонымі-археолагамі і агульнаадукацыйнымі ўстановамі ў савецкі час ажыццяўлялася на "выдатна". У гэтым перакалана размова з галоўным навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктарам гістарычных навук, прафесарам Пятром Фёдаравічам Лысенкам. Наколькі актыўна археалогіяй займаюцца сучасныя настаўнікі і вучні? Ці часта разам з прафесійнымі археолагамі яны шукаюць сведчанні мінулых эпох? Як сённяшнім школам атрымаць па археалогіі "выдатна"? Адказ на гэтыя пытанні мы шукалі не толькі з Пятром Фёдаравічам, але і са старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі НАН Беларусі кандыдатам гістарычных навук Наталляй Мікалаеўнай Дубіцкай.**



Перанос унікальнай пабудовы ў бяспечнае месца.

## Ад чатырнаццаці і старэй



Падчас працы на раскопках старажытнага Бярэсця.

Па словах Наталлі Мікалаеўны Дубіцкай, у нашай краіне археалагічныя раскопкі праводзяцца ў адпаведнасці з Законам "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь". Археалагічныя помнікі павінны вывучацца належным чынам, згодна з навуковай методыкай. Для гэтага неабходна атрымаць у палявым камітэце Інстытута гісторыі НАН Беларусі спецыяльны дазвол, так званы адкрыты ліст. Выдаецца ён толькі асобам, якія валодаюць пэўнай кваліфікацыяй. Самы просты дазвол — гэта форма № 3, якая дае права толькі на даследаванне і збор пад'ёмнага матэрыялу. На непасрэднае правядзенне раскопак выдаецца форма № 1 або форма № 4 (для ратаўнічых раскопак, калі ідзе разбурэнне археалагічнага помніка і яго тэрмінова трэба даследаваць). Раскопкамі ж могуць кіраваць толькі прафесійныя археолагі, усе астатнія, хто капае без адкрытага ліста, з'яўляюцца чорнакапальнікамі.

— Па заканадаўстве мы маем права далучаць дзяцей да раскопак толькі з 14 гадоў. Працаваць яны могуць 4 гадзіны ў дзень. З 16 гадоў — ужо 6 гадзін, з 18 гадоў — 8 гадзін. Нярэдка мы прымаем у археалагічную каманду і дзяцей малодшага ўзросту, але яны могуць толькі назіраць за раскопкамі. У савецкія часы супрацоўніцтва вучоных-археолагаў са школамі было адпрацавана да драбязей. Так, была ўстаноўлена пэўная археалагічная норма. Напрыклад, на раскопках старажытнага гарадскога пасялення, дзе грунт больш цяжкі і капаць трэба ў глыбіню на некалькі метраў, норма на двух чалавек складала адзін квадрат памерам 2×2 метры і глыбінёй 20 сантыметраў. На раскопках паселішчаў жалезнага веку, дзе праца была не такой цяжкай, — 2 такія квадраты, а паселішчаў каменнага веку — 2 квадраты (адзін квадрат памерам 1×1 метр і глыбінёй 10 сантыметраў). Адна з галоўных прычын папулярнасці археалогіі сярод школьнікаў у савецкія часы заключалася ў тым, што за выкананне ўстаноўленай падчас раскопак нормы дзеці абавязкова атрымлівалі грошы. Неабходная сума выдзялялася Інстытутам гісторыі, а таксама дзяржаўнымі музеямі, куды перадаваліся знойдзеныя прадметы.

## Прэмія за грэбень

— У 60-я гады, калі мы пачыналі раскопваць са школьнікамі старажытнае Бярэсце, за выкананне нормы плацілі 1 рубель 13, 15 ці 18 капеек. У 70-я гады аплата складала ўжо 2 рублі і 60 або 70 капеек. Норма вызначалася наступным чынам: браўся сярэдні заробак рабочага і сума разбівалася на колькасць працоўных дзён у месяцы. За ўнікальныя знаходкі выплачвалася дадатковая прэмія. Напрыклад, брэсцкаму школьніку Віцю Пятручуку, які знайшоў у слоі XIII стагоддзя ўнікальны для Усходняй Еўропы грэбень з алфавітам, выплацілі максімальную па тым часе прэмію ў памеры трох норм. Праца на археалагічных аб'ектах была для вучняў добрай магчымасцю зарабіць грошы на веласіпед, магнітафон, школьныя прыналежнасці. Акрамя асноўнага заробку, вучні імкнуліся атрымаць прэміі, а значыць, знайсці ўнікальны прадмет, таму дзеці старанна, міліметр за міліметрам, перабіралі выкапаны грунт. Работа на археалагічных аб'ектах дазваляла школьнікам не толькі на практыцы вывучаць мінулае роднага краю, карысна праводзіць летнія канікулы, але і садзейнічала працоўнаму выхаванню моладзі. Дзеці спазнавалі, што рубель — гэта не проста паперка, яго трэба зарабіць цяжкай працай. Можа, таму ніводны з юных археолагаў, якія працавалі са мной і ў Брэсце, і ў Тураве, і ў Давыд-Гарадку, не вырас гультаём, усе сталі годнымі людзьмі. Была ў нас і такая традыцыя: з першага археалагічнага заробку вучні абавязкова куплялі падарунак матулі, — расказвае Пётр Фёдаравіч.

## Не толькі рублём

Канечне, рубель — гэта добры сродак, каб прыцягнуць дзяцей да ўдзелу ў археалагічных раскопках. Аднак у сучасных умовах трэба шукаць новыя неграшовыя спосабы стымулявання юных археолагаў. І тут на дапамогу могуць прыйсці школьныя музеі. На жаль, з кіраўнікамі такіх музеяў прафесійныя археолагі супрацоўнічаюць не вельмі актыўна. І дарэмна, паколькі, згодна з Законам "Аб музеях і музейным фондзе Рэспублікі Беларусь", усе школьныя музеі з'яўляюцца дзяржаўнымі. І калі ў такіх музеях створаны належныя ўмовы для захоўвання экспанатаў, то чаму б навукоўцам не скласці неабходны акт і не перадаць сюды знойдзеныя вучнямі археалагічныя прадметы. Неабавязкова перадаваць унікальныя экспанаты, можна абмежавацца шырока распаўсюджанымі рэшткамі керамікі або прадметамі побыту першабытных людзей. Для вучняў і такія экспанаты будуць не менш каштоўнымі, чым, скажам, славуты берасцейскі грэбень з азбукай, бо яны адкапаны ўласнымі рукамі. Пад гэтымі новымі музейнымі экспанатамі можна размясціць шыльдачку, на якой пазначыць, што такі школьнік і ў такім годзе знайшоў гэты прадмет. Напэўна ж, вучню будзе прыемна, калі падчас экскурсіі прагучыць яго прозвішча. Ды і праз многія гады ён зможа прывесці ў школьны музей сваіх дзяцей і расказаць ім, як некалі праводзіў незабыўныя летнія дні сярод лесу на старажытным кургане. Гэтую думку пацвярджаюць словы Пятра Фёдаравіча Лысенкі:

— Ідзём мы з Наталляй Мікалаеўнай сёлета вясной па брэсцкай вуліцы, а да нас падыходзіць мужчына і на радасцях, нібыта дзіця, гаворыць: "Пётр Фёдаравіч, вы мяне памятаеце?". Аказалася, гэта адзін з тых 2 тысяч школьнікаў, якія раскопвалі пад маім кіраўніцтвам у 70-я гады драўляныя пабудовы Бярэсця XIII стагоддзя. У той час яму было прыкладна 13 гадоў, цяпер жа ў гэтага мужчыны свае дзеці, унукі, якіх ён водзіць у брэсцкі музей і расказвае пра сваё "археалагічнае" дзяцінства. Падчас сустрэчы я спытаў, ці было яму цяжка, ці не крыўдзіў я іх. Ён заўсміхаўся і сказаў, што не, гэта былі самыя лепшыя гады дзяцінства. Сёлета музею "Бярэсце" споўнілася 30 гадоў (дарэчы, трохмільённым наведвальнікам музея стаў адзін з удзельнікаў знакамітых раскопак). А вось на 25-годдзе мы склалі спісы ўсіх вучняў, якія працавалі на раскопках. Людзі прыходзілі на юбілей разам з дзецьмі, унукамі, шукалі сябе ў гэтых спісах і, калі знаходзілі прозвішча, аж падскоквалі ад радасці. Сталыя ўжо людзі сустракаліся з былымі аднакласнікамі, узгадвалі археалагічную практыку. А ўзгадаць было што, паколькі многія вучні працавалі на раскопках па некальк і гадоў. У нас быў настолькі дружны калектыў, што мы нават стварылі футбольную каманду. Памятаю, неяк гулялі з ваеннаслужачымі адной з воінскіх часцей Брэста. Мы, праўда, тады прайгралі, але з невялікім лікам, — дзеліцца Пётр Фёдаравіч.

## Дзякуючы школьнікам

Падчас гэтых успамінаў знакаміты вучоны выказаў і такую цікавую думку: "Калі б не школьнікі, то Бярэсце не было б раскапана". Пётр Фёдаравіч упэўнены, што калі б не навучэнцы з Жыткавіч, то мы не маглі б цяпер азнаёміцца на тураўскім замчышчы з падмуркам старажытнага сабора, калі б не давыд-гарадоцкія настаўнікі і вучні, то старажытны палескі горад на беразе Гарыні ў 1967 годзе не раскрыў бы некаторыя таямніцы сваёй гісторыі.

Такую ж думку можна выказаць і ў адносінах да сучаснасці. Калі б не зацікаўленасць настаўніка гісторыі старадарожскай сярэдняй школы № 2 Віталя Анатольевіча Юрэвіча і дырэктара Цэнтра турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі Старадарожскага раёна Вячаслава Іванавіча Прэдчанкі, якія разам з вучнямі падчас работы археалагічных летнікаў шукаюць сведчанні жыцця дрыгавічоў; калі б не апантанасць настаўніка гісторыі сярэдняй школы № 3 Мёраў Вітаўта Антонавіча Ермалёнка, намаганнямі якога ў школьным музеі сабрана ўнікальная археалагічная калекцыя; калі б не зацікаўленасць дырэктара Рагачоўскага раённага цэнтра турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі Генадзя Васільевіча Цітовіча, які шукае сведчанні старажытнасці Рагачоўшчыны; калі б не захопленасць настаўніка гісторыі сярэдняй школы № 5 Жлобіна Сяргея Пятровіча Паграбецкага, не былі б вядомы таямніцы гарадзішча Чырвоная Горка...

Гэты спіс, дзе сумесная з навукоўцамі археалагічная работа вядзецца на "выдатна", можна працягваць доўга. Аднак многім установам адукацыі варта пастарацца, каб атрымаць па археалогіі высокую адзнаку. А для гэтага патрэбна не толькі жаданне з боку настаўнікаў і вучняў, але і канкрэтныя дзеянні Інстытута гісторыі НАН Беларусі і мясцовай улады.

## Здольнасці ёсць, але...

Падчас камандзіровак ад настаўнікаў-краязнаўцаў неадночы даводзілася чуць, што апошнім часам школьны археалагічны рух сцішыўся. Канечне, педагогі і навучэнцы па-ранейшаму займаюцца археалагічнымі раскопкамі, аднак гэта ўжо не той узровень, які быў, скажам, у савецкія часы. Сучасная школьная археалогія нагадвае здольнага студэнта, якому для вучобы на "выдатна" перашкаджаюць пэўныя прычыны: то часу не хапае, то выкладчыкі занадта патрабавальныя, то стыпендыя невялікая і г.д. Аднак, калі ёсць здольнасці, то трэба і вучыцца на "выдатна". Як гэта рабіць, падкажа вопыт мінулых гадоў.

**Ігар ГРЭЧКА.**
*hrechka@ng-press.by*
**Фота з архіва П.Ф.ЛЫСЕНКІ.**

Ігар Грэчка. Пераздаць археалогію на «выдатна»